Источник: "Веды" - 2012-04-25

# УНЁСАК У ВЯРТАННЕ ГІСТАРЫЧНАЙ ПАМЯЦІ




**Філолаг, гісторык і філосаф, доктар філалагічных навук Іван Саверчанка адзначыў 2 красавіка 2012 года сваё 50-годдзе. А незадоўга да юбілею пабачыла свет яго новае даследаванне – «Паэтыка і семіётыка публіцыстычнай літаратуры Беларусі XVI-XVII стст.», якое выйшла ў Выдавецкім доме «Беларуская навука».**



З гэтай нагоды 10 красавіка ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы НАН Беларусі ладзілася прэзентацыя манаграфіі і кніжная выстава «Творчая лабараторыя даследчыка: каштоўнасці кніжна-пісьмовай культуры». Павіншаваць юбіляра завіталі навукоўцы, выкладчыкі і сябры з Саюза пісьменнікаў Беларусі.

За свой трыццацігадовы шлях у навуцы І.Саверчанка паспеў зрабіць надзвычай многа, працы налічваюцца ўжо дзесяткамі. Што да супрацоўніцтва з Выдавецкім домам «Беларуская навука», яно было распачата ў 2008 годзе выхадам у свет кнігі «Францыск Скарына. Выбраныя творы», дзе Саверчанка выступіў укладальнікам, аўтарам прадмовы і перакладчыкам на беларускую мову. Праз два гады выйшла анталогія «Беларуская літаратура X-XV стст.», і вось мы знаёмімся з чарговым плёнам таленту даследчыка – аналізам публіцыстычнай літаратуры Беларусі XVI-XVII стагоддзяў. Па словах галоўнага рэдактара Выдавецкага дома «Беларуская навука» Георгія Кісялёва, сёння І.Саверчанка ўваходзіць у топ-10 аўтараў выдавецтва. Дырэктар акадэмічнага Інстытута мовы і літаратуры Аляксандр Лукашанец адзначыў важкасць прац даследчыка і ў міжнародным кантэксце для пашырэння звестак пра Беларусь і яе культуру.

Першыя манаграфіі І.Саверчанкі былі пераважна гістарычнага характару, там змяшчалася значна больш фактаграфічных звестак, аналізаў твораў, тэарэтычных абагульненняў. Чарговая праца насычана новымі рысамі даследавання. Як слушна зазначыў на прэзентацыі акадэмік Уладзімір Гніламёдаў, «паэтыка – гэта тыя высушаныя эмоцыі, тая мастацкая плоць, якая перадаецца з традыцыяй, фарміруе літаратуру, таму, мабыць, паэтыка і ёсць самы галоўны прадмет цікавасці навукоўца-літаратуразнаўца».

У новай манаграфіі даследчык выявіў уласна літаратурную і мастацка-эстэтычную каштоўнасць публіцыстычнай спадчыны майстроў мастацкага слова эпохі Рэнесанса і барока. Упершыню раскрыта роля ў інтэлектуальным жыцці старажытнай Беларусі Францыска Скарыны, Сымона Буднага, Васіля Цяпінскага, Стэфана і Лаўрэнція Зізаніяў, Льва Сапегі, Іпація Пацея, Лявонція Карповіча, Мялеція Смятрыцкага, Іасафата Кунцэвіча, Іосіфа Вельямін-Руцкага, Андрэя Мужылоўскага, Афанасія Філіповіча, Сільвестра Косава, Кірылы Транквіліёна-Стаўравецкага. Вызначаны галоўныя мастацкія крытэрыі, якімі кіраваліся гэтыя майстры пры выбары тыпу дыскурсу і жанравай формы. У працы зроблена навукова карэктная класіфікацыя помнікаў публіцыстычнай літаратуры Беларусі часоў Адраджэння паводле родава-жанравай прыналежнасці, устаноўлена і усебакова абгрунтавана палажэнне аб тым, што старабеларуская публіцыстычная рэлігійная і свецкая літаратура Беларусі гэтага часу ўключала 12 асноўных жанравых комплексаў.

І.Саверчанка ўстанавіў дамінаванне ў творах публіцыстыкі маральна-філасофскай, антрапалагічнай і царкоўна-рэлігійнай праблематыкі. Раскрыта шчыльная сувязь публіцыстычнага пісьменства з дзелавым дыскурсам, аб чым сведчылі асноўныя віды і тыпы азначэнняў. У працы таксама засведчана, што беларускія пісьменнікі-інтэлектуалы прапанавалі грамадству адказы на анталагічныя пытанні быцця, акрэслілі неабмежаваныя магчымасці чалавечага розуму ў спасціжэнні навакольнага свету, узнялі праблему эвалюцыі Зямлі і жыцця, сфармулявалі базавыя прынцыпы суадносінаў дзейнасці чалавека з законамі прыроды і космасу. Да таго ж пісьменнікі-публіцысты абгрунтавалі ідэю выключнай ролі духоўнага лідэра, асабліва значэнне мастацкага слова і літаратуры ва ўдасканаленні грамадскіх стасункаў.

Паводле працы па даследаванні формы твораў, манаграфія паказала тыпалогію тропаў, фігур, рытмікі, што выкарыстоўваліся ў публіцыстычнай літаратуры Беларусі XVI-XVII стагоддзяў. Акрамя таго, выяўлены асноўныя інструменты і галоўныя сродкі ўтварэння рытмічнага дыскурсу ў публіцыстычных творах з аднолькавай або падобнай метрычнай будовай.

Асобных слоў заслугоўвае выстава, падрыхтаваная да прэзентацыі супрацоўнікамі аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў ЦНБ і прадстаўленая на прэзентацыі Аленай Цітавец. Тут паказаны помнікі кніжна-пісьмовай культуры XVI-XVII стагоддзяў, якія сталі прадметам навуковага аналізу даследчыка. Адкрывае экспазіцыю шэдэўр кнігадрукавання Вялікага Княства Літоўскага XVI стагоддзя – «Брэсцкая Біблія» 1563 года, выдадзеная на сродкі ўплывовага магната Мікалая Радзівіла Чорнага. Таксама было прадстаўлена першае беларускае друкаванае «Евангелле вучыцельнае», выдадзенае Іванам Фёдаравым і Пятром Мсціслаўцам у Заблудаве. У ім упершыню змешчана пропаведзь славутага беларускага асветніка XII стагоддзя Кірылы Тураўскага «Слова на Ушэсце». Па прызнанні самога юбіляра, з азначанага перыяду літаратуры яго найбольш уражваюць высокапаэтычныя малітвы Тураўскага і першы друкаваны помнік старажытнай Беларусі – «Катэхізіс» Сымона Буднага, з даты выхаду якога сёлета спаўняецца 450 гадоў.

Свецкія выданні азначанай эпохі прадстаўлены на выставе «Лексіконам славянароскім», які быў выдадзены ў Куцейне ў 1653 годзе. Асобны раздзел прысвечаны творчым здабыткам Івана Саверчанкі і складаецца з манаграфій, падручнікаў, тэксталагічных выданняў, навуковых публікацый і гістарычных эсэ.

**Алена БЯГАНСКАЯ, «Веды»**
**Фота А.Сцефановіча**

Алена Бяганская. Унёсак у вяртанне гістарычнай памяці